УДК 94(476):327.8”1917/1920”

**Р. Р. Лазько**
*ГДУ ім. Ф. Скарыны, г. Гомель*

# НА ПАКУТНАЙ ДАРОЗЕ ЗНАЙШЛІ СВАЮ НАЦЫЮ… (АБ НАЦЫЯНАЛЬНЫМ БЕЛАРУСКІМ РУХУ 1917–1920 ГАДОЎ)

*Першая сусветная вайна разглядаецца ў артыкуле як “аптымістычная трагедыя” беларускага народа. На пакутных дарогах гэтай вайны беларусы здолелі “знайсці сябе” як нацыю, а разам з гэтым прымусілі лічыцца з сабой новых прэтэндэнтаў на ролю гаспадароў беларускага краю – Польшчу і Савецкую Расію. Аднак сіл для таго, каб стварыць поўнавартасную дзяржаву у іх не хапіла.*

## *1. Чым дапаможа сінэргетыка?*

Беларускія даследчыкі, ацэньваючы ўзровень развіцця беларускага руху пачатку XX стагоддзя, дружна адзначаюць яго слабасць у параўнанні з рухамі суседніх народаў, хоць адначасова і ўказваюць, – праўда, ужо не настолькі аднагалосна – на яго паскарэнне ў гады Першай сусветнай вайны. Ужо не адзінкавымі з’яўляюцца спробы яго стадыяльнай класіфікацыі, але ў гэтай вобласці назіраецца выразнае разыходжанне поглядаў: адны даследчыкі, сярод іх і такі аўтарытэтны, як прафесар Мечыслаў Грох, адносяць яго да фазы нацыянальнай агітацыі (“фаза B”), іншыя (Сяргей Токць, напрыклад), лічаць, што ён у 1917 г. знаходзіўся паміж фазай B і наступнай – фазай масавай палітычнай мабілізацыі (фаза C), а затым нават, у выглядзе беларусізацыі ў БССР, пераскочыў у фазу D (напамінаем, гісторыкі лічаць, што гэтую фазу складае рэальная нацыянальная дзяржава). Хоць нам бліжэйшай уяўляецца другая ацэнка (назавем яе аптымістычнай), але з другой яе

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

часткай, наконт “пераскоквання” у фазу D, немагчыма пагадзіцца. Бо калі так, калі сапраўды ў 1920-я гады існавала беларуская дзяржава, якая працягвала працэс нацыятварэння, то куды яна падзелася ў наступным дзесяцігоддзі? Нельга ж аспрэчваць той факт, што беларусізацыю, а праз некалькі год знішчэнне беларускіх нацыянальных эліт, праводзіла адна і тая ж дзяржава. Дык якая ж тут фаза Д?

Але першая канцэпцыя (умоўна “песімістычная”) не меней заганная. Прыняўшы яе, немагчыма патлумачыць сапраўдны выбух актыўнасці беларускага руху пасля Лютаўскай рэвалюцыі ў Расіі, калі, развіваючы літаральна ўсе кампаненты беларускага нацыятварэння, нацыянальныя эліты ўзяліся таксама за стварэнне палітычных асноў беларускай дзяржаўнасці. На гэтую справу яны атрымалі мандат масавага народнага прадстаўніцтва – снежаньскага Усебеларускага з’езда. Дык якая гэта была фаза ў беларускім руху? Рэальная гістарычная сітуацыя не ўпісваецца ў стаўшую папулярнай стадыяльную схему.

Каб наблізіцца да ісціны (наблізіцца, а не вычарпаць яе), неабходна шукаць дадатковы інструментарый. На нашу думку, эфектыўным інструментам пры рашэнні гэтай задачы становяцца метады сінергетыкі, яе ідэя аб біфуркацыі – раздваенні, раздзяленні самаарганізуемай сістэмы, калі на змену эвалюцыйнаму яе развіццю прыходзіць час крызісу, які адкрывае магчымасць фарміравання новай рэальнасці. Рускі эміграцыйны фізік і філосаф Ілля Прыгожын істотна дапоўніў гэту ідэю тэзісам аб нестабільнасці як адной з фундаментальных уласцівасцей прыроды і праяўленні гэтай уласцівасці ў каскаднай біфуркацыі. Гаворка пра тое, што новыя макраструктуры ўзнікаюць, як правіла, у выніку, каскаду біфуркацый, а не аднаразовага акта [1, с. 46–62].

Погляд на падзеі расійскай і еўрапейскай гісторыі ў перыяд, пазначаны ў загалоўку (1917 – 1920, пачатак 1921 г.), з сённяшняй стогадовай дыстанцыі не пакідае сумненняў у тым, што ўвесь гэты час уяўляе сабой хвалю ўздыму беларускага этнасу і нацыянальнага руху ва ўмовах і пад уплывам біфуркацыі ўзаемазалежных сацыяльных сістэм розных узроўняў – міжнародных адносін, расійскай дзяржавы, і ўласна беларускага руху. У выніку “Вялікай вайны” увесь свет станавіўся іншым. Але паколькі нас цікавіць менавіта беларускі нацыянальны рух, то мы і будзем разглядаць яго як падсістэму ў кантэксце крызісу (час кайрасу) і біфуркацыі сістэм больш высокага ўзроўню, перш за ўсё, расійскай дзяржаўнасці. Гэтаксама, як расійская дзяржава не магла выйсці з крызісу без страты асобных сваіх якасцей і адначасова – без новых набыткаў, так і



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

беларускі рух не мог выйсці з яго эвалюцыйна, толькі за кошт нарошчвання існаваўшых сваіх якасцей. Ён мог толькі *вырвацца* з прасторы–часу крызісу праз якасны скачок, становячыся іншым.

*2. Вайна. Бязладдзе. "Трэба ратавацца"*

Разгледзім цяпер асноўныя параметры крызісу расійскай дзяржавы, які найболей уплываў на фарміраванне новых якасцей беларускага этнасу, уключаючы і яго здольнасць да ўласнай дзяржаватворчасці. Да іх ліку неабходна аднесці страту дзяржаўнымі інстытутамі здольнасці падтрымліваць бяспеку, іншыя параметры жыццядзейнасці соцыума, іх дэмаралізуючы уплыў на грамадства, а з другога боку – набыццё беларускім этнасам новага вопыту, новых ведаў аб самім сабе і акружаючым яго свеце.

Асноўным зместам расійскай гісторыі перыяду сусветнай вайны быў разрыў рускага народа з інстытутам манархіі, а затым адкідванне ім рэспубліканскай формы дзяржаўнасці і выбар у выніку крывавай грамадзянскай вайны жорсткай леварадыкальнай дыктатуры – бальшавіцкай. Такім чынам, народ атрымаў "найбольш нацыянальны рускі ўрад", – як пісаў умераны рускі кансерватар У. А. Маклакоў, – урад, які адпавядаў народу тым, што "загадваў і даваў радасць паслушэнства", але неразрыўна з гэтым ствараў і для народа магчымасць загадваць. У выніку "ранейшыя рабы адчулі сябе панамі..." [2, с. 27–28].

Пачаты ў гады сусветнай вайны кругабег палітычнага развіцця Расіі ад адной формы аўтарытарнасці да другой, праз этапы адкідвання дэмакратычнага рэспубліканскага ладу і грамадзянскай вайны, набіраючы сілу стыхіі, вырваўся за межы палітыкі, ахапіў усе сферы грамадскага жыцця і ўключыў працэс "разбягання" народаў Расіі ад цярпеўшага крызіс імперскага цэнтра. У канцы 1917 г. гэты многапланавы расійскі крызіс дасягнуў істотнага рубяжа ў сваім развіцці, аднаго з момантаў біфуркацыі, выявіўшы варыянтнасць, альтэрнатыўнасць яго пераадолення на тэрыторыі карэннай Расіі і на яе нацыянальных ускраінах. Следам за акупаванымі Германіяй тэрыторыямі Польшчы, Прыбалтыкі пазарасійскія мадэлі пераадолення крызісу склаліся і ў іншых нацыянальных раёнах у выглядзе праграм выхаду гэтых раёнаў са складу Расіі. Калі прасачыць уплыў расійскага крызісу на Беларусь, то прыйдзем да сцвярджэння, што менавіта ў гэтым годзе ўпершыню за многія гады гістарычны працэс накрэсліў перад беларускім народам асобны ад расійскага варыянт гістарычнага развіцця. Узнікшая сітуацыя ўжо вызначана беларускім гісторыкам як "час выбару" [3], і да гэтай слушнай ацэнкі застаецца толькі дадаць, што *працэс гістарычнага*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

*выбару* беларусаў набыў хвалепадобны, ці, як адзначалася вышэй, каскадны характар, і зацягнуўся на некалькі год. Менавіта фарміраванне для беларускага народа сітуацыі *гістарычнага выбару* дазваляе ацаніць яе ў парадаксальнай формуле: гэта была *аптымістычная трагедыя*. У ходзе яе ўзнікла не толькі неабходнасць, але і прынцыповая ажыццявімасць для беларускага народа гістарычнага рыўка ад стану "рэчы ў сабе" да стану гаспадара свайго краю і свайго лёсу ў ім.

Менавіта дзеля таго, перш за ўсё, каб зразумець неабходнасць і адначасова прынцыповую магчымасць такога рыўка, беларускім гісторыкам неабходна з максімальнай паўнатой прасачыць уздзеянне на Беларусь расійскага крызісу 1914–1918 і некалькіх наступных гадоў як сістэмнага складанага фактару фарміравання новых якасцей беларускага народа, уключаючы і яго здольнасць да ўласнай дзяржаватворчасці.

Рашэнне гэтай прафесіянальнай задачы абумоўлена неабходнасцю пераадолення беларускімі гісторыкамі ментальных *табу*, якія фарміраваліся на працягу дзесяцігоддзяў, і выключалі для даследчыкаў самую магчымасць пастаноўкі пытання аб несупадзенні інтарэсаў у Першай сусветнай вайне дзяржаўнага рускага народа і інтарэсаў іншых народаў імперыі, уключаючы ўсходнеславянскія. Аднак гэтаксама, як вопыт сусветнай вайны за некалькі год разбіў ідэалагему аб трыадзіным рускім народзе ў свядомасці беларусаў, так добрасумленнае і ўсебаковае даследаванне гэтага вопыту разбівае звязаныя з вайной стэрэатыпы, уключаючы і стэрэатып аб яе гераічным характары для рускага народа і супадзенні яго інтарэсаў у гэтай вайне з інтарэсамі іншых усходнеславянскіх народаў. З улікам існуючай у беларускай гістарыяграфіі сітуацыі важна якраз тое, што пераадоленню такіх табу і стэрэатыпаў спрыяюць дасягненні расійскай гістарычнай навукі апошніх гадоў, забяспечаныя не ў апошнюю чаргу на аснове антрапалагічнага падыходу да вывучэння Першай сусветнай вайны і ўвядзення ва ўжытак новых крыніц, у прыватнасці салдацкіх лістоў з фронту і іншых.

Беларусь як Паўночна-Заходні край Расійскай імперыі была такім яе геапалітычным рэгіёнам, дзе крызіс расійскай дзяржаўнасці ў гады вайны праявіўся найбольш глыбока і ўсёабдымна, ахапіўшы ўсе сферы дзяржаўнага і сацыяльнага жыцця, паставіўшы на мяжу нацыянальнай катастрофы гістарычнага гаспадара гэтага краю – беларускі народ. Такія маштабы расійскага крызісу на беларускай зямлі былі абумоўлены, па-першае, тым, што Беларусь на некалькі год (з восені 1915 да канца 1917 г.) ператварылася ў эпіцэнтр

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

крывавай барацьбы Расійскай дзяржавы з яе наймацнейшым сапернікам – Германіяй, і ў гэтай якасці мусіла несці ўсе ахвяры гэтай барацьбы, значна пераўзыходзіўшыя ахвяры, выпаўшыя на долю іншых рэгіёнаў імперыі. Па-другое, маштабы крызісу ў Паўночна-Заходнім краі вызначаліся неадпаведнасцю традыцыйна-імперскага ідэалагічнага абгрунтавання мэтаў вайны ("за Веру, Царя и Отечество") нацыянальным, рэлігійным і сацыяльным рэаліям поліэтнічнага, шматканфесійнага, калісьці *забранага* той жа Расіяй краю. Па гэтых прычынах няздольнасць Расійскай дзяржавы даць эфектыўныя адказы на выклікі, пастаўленыя першай ў гісторыі свету татальнай вайной [4], тут, на беларускай зямлі, выявілася з надзвычайнай сілай. Як татальная вайна, першая сусветная стала вайной узброеных *нацый*, хоць апошні тэрмін, як убачым далей, мала адпавядаў узроўню кансалідацыі рускага народа. Аднак несумненна тое, што за час знаходжання Беларусі ў складзе Расійскай імперыі ўпершыню на яе тэрыторыі ў амаль што двухмільённай масе рускага войска, няспынна і па розных каналах звязанага з глыбокім тылам, быў прадстаўлены сам рускі народ з дасягнутым ім да таго часу ўзроўнем матэрыяльнай і духоўнай культуры. Ментальна-псіхічныя якасці пасланага на вайну рускага народа сталі не меней важным складнікам, чым матэрыяльныя, няздольнасці Расіі супрацьстаяць яе моцным заходнім праціўнікам і абумовілі яе паражэнне не толькі як дзяржавы, але і як пэўнага тыпу цывілізацыі. А гэтая няздольнасць, у сваю чаргу, стала важным фактарам паскарэння цэнтрабежных тэндэнцый у шматнацыянальнай Расійскай імперыі і пачатку яе распаду па нацыянальных межах.

У якасці аднаго з першых накірункаў уздзеяння расійскага крызісу на Беларусь склалася ўсведамленне яе насельніцтвам неэфектыўнасці расійскага войска як абаронцы краіны і ашаламленне, выкліканае прымяненнем ім негуманных спосабаў барацьбы з праціўнікам, спосабаў жорсткіх і разбураючых матэрыяльныя асновы існавання карэннага народа. Як вядома, к зыходу першага года вайны рускія войскі на беларуска-польскім накірунку саступілі праціўніку вялізную тэрыторыю "Царства Польскага", адышлі на тэрыторыю Беларусі, дзе пасля ліквідацыі Свянцянскага прарыву германцаў фронт стабілізаваўся на доўгія два з паловай гады. Толькі ў летнюю кампанію 1915 г. было страчана забітымі і параненымі 1 410 000 чалавек – у сярэднім па 235 тыс. чалавек за месяц. Палоннымі ў тую ж кампанію расійская армія страціла амаль 1 млн. чалавек, у сярэднім па 160 тыс. чалавек за месяц. У 1916 г. страты таксама былі вялікімі: за год яны перавысілі 2 млн. чалавек забітымі і параненымі і 344 тыс.



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

палоннымі [5, с. 307, 330; 6, с. 474–484]. Але і самі гэтыя страты, будучы адной з прычын крызісу людскіх рэсурсаў, адначасова з'яўляліся вынікам адсталасці Расіі, якая выяўлялася ў недастатковым узроўні матэрыяльнага забеспячэння войск, у вялізным бюракратычным наросце на дзеючай арміі і ў нездавальняючай эфектыўнасці кіравання войскамі. Гэтыя прычыны няўдач расійскага войска, якія прывялі вайну на тэрыторыю Беларусі, не былі сакрэтам і для беларускіх сялян: "Няўжо ж нашы не здзержаць яго (немцаў – Р. Л.). Столькі ж народу пабралі са ўсёй Расіі, – запісваў адзін з назіральнікаў у Ігуменскім павеце. – Але ж снарадаў няма, кажуць, і начальства ўзяткі бярэ і прадае крэпасці і планы. У нас заўсягды так, – гаварылі сяляне. – Таперача снарадаў няма; а што рабіла начальства да вайны і ў час вайны – ганяла налогі, акцызы, толькі глядзела, як бы гэта апошнюю капейку з мужыкоў здзерці" [7, с. 824].

"Пабралі з усёй Расіі" за гады вайны, акрамя кадравай арміі, якая складала 1,4 млн. чалавек, 5,6 млн. падрыхтаванага рэзерву і 10,6 млн. прызыўнікоў іншых разрадаў, якімі папаўнялі панесеныя страты [6, с. 481–482]. Папаўненні, аднак, не прывялі да павышэння баяздольнасці войск. Наадварот. Пасля стабілізацыі фронту на тэрыторыі Беларусі дрэнна забяспечаныя і неадпаведна падрыхтаваныя рускія войскі не здабылі тут ні адной перамогі, усе праведзеныя імі наступальныя аперацыі заканчваліся паражэннямі з вялікімі матэрыяльнымі і людскімі стратамі. Да лета 1917 г. руская армія наогул страціла здольнасць ваяваць, аб чым сведчаць ход і вынікі апошняй яе наступальнай аперацыі. Нягледзячы на забяспечаную пры яе падрыхтоўцы значную перавагу рускіх войск, наступленне скончылася цяжкім іх паражэннем, і яно было прадвызначана яшчэ да пачатку аперацыі. Аб гэтым гавораць шматлікія факты адмовы часцей займаць зыходныя пазіцыі і адсутнасць хоць якога-небудзь імкнення развіць першапачатковы поспех з боку тых часцей, якія ўсё ж такі пайшлі ў наступленне. Некаторыя з іх адразу ж вярталіся да сваіх акопаў, як толькі сутыкаліся з праціўнікам [8, с. 79, 80].

Правал летняга наступлення 1917 г. войск Заходняга фронта дазваляе ўбачыць іншую прычыну паражэнняў Расіі на тэрыторыі Беларусі і ў вайне наогул, больш важную, чым яе матэрыяльна-тэхнічная адсталасць. Неабходна згадзіцца з тымі расійскімі ваеннымі спецыялістамі, удзельнікамі Першай сусветнай вайны, якія бачаць такую прычыну *ў этнічнай неразвітасці рускага народа,* які заставаўся патрыярхальным этнасам з уласцівымі для гэтай стадыі этнічнага развіцця якасцямі. Карэннае рускае насельніцтва, пісаў

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

пасля вайны былы генерал-кватэрмайстар Рускай арміі Ю. Н. Данілаў, "галоўнай сваёй масай жыло ў цемнаце і непісьменнасці. Гэта насельніцтва было раскідана па вёсках, раз'яднанае паміж сабою вялізнымі адлегласцямі, дрэннымі камунікацыямі і пагружана з галавой у сваё цяжкае непрыгляднае гаспадарчае жыццё" [9, с. 29] . Такі стан матэрыяльнага існавання не спрыяў фарміраванню ў масе народа нацыянальнай свядомасці і засваенню нацыянальных інтарэсаў, а на гэтай аснове – агульнарасійскага патрыятызму. Шмат камандзіраў паведамлялі камандаванню аб адсутнасці гэтых якасцей у рускіх салдат. Удзельнік вайны генерал Галавін цытуе шэраг такіх рапартаў: "Няма дысцыпліны, няма вывучкі, няма жадання працаваць як усведамлення абавязку, любові да радзімы, няма асноўных паняццяў аб свабодах. Поўная самаволя ў выкананні загадаў. Адна думка – хутчэй бы мір. А як сродак – нічога не рабіць…", – паведамляў камандзір 5-й стралковай дывізіі генерал Лебедзеў. "Некультурныя масы, пазбаўленыя здаровага пачуцця патрыятызму і нацыянальнага адзінства, не ўсведамляюць задач і мэтаў вайны…, – пісаў памочнік начальніка штаба Вярхоўнага галоўнакамандуючага палкоўнік Новікаў [5, с. 241, 242].

Такім чынам, перайшоўшае восенню 1915 г. да пазіцыйнай вайны расійскае войска было часткай народа, які не выпрацаваў пачуццяў нацыянальнага адзінства і супольнай адказнасці за лёс радзімы. Больш чым двухгадовае стаянне на беларускай зямлі гэтага войска выявіла таксама іншыя негатыўныя якасці рускага этнаса, набытыя ў ходзе гістарычнага развіцця (пры тым, што мясцовым насельніцтвам заўважаліся і станоўчыя якасці [10], але яны, аднак, ва ўмовах ваеннай трагедыі не пераважвалі адмоўных). Пацвярджалася характарыстыка, дадзеная народу яго інтэлектуаламі, адпаведна якой рускі народ нават не асвоіў тэрыторыю сваёй дзяржавы, а на абжытай зямлі не цікавіўся "сярэдняй вобласцю культуры" [11, с. 331] – культуры штодзённасці, быту, міжлюдскіх адносін. Ён засвоіў нізкі ўзровень працоўнай культуры, няўменне шанаваць сваю і чужую працу, звычку жыць адным днём. Частка гэтага народа, апранутая ў салдацкія шынялі, не магла бараніць і берагчы чужую для яго зямлю, якой была беларуская.

Насуперак існуючаму ў гістарычнай літаратуры стэрэатыпу, у першыя гады вайны не з бальшавікамі ішло на фронт бязладдзе, анархія – ім дарогу на фронт адкрыла толькі дэмакратычная Лютаўская рэвалюцыя – а з маршавымі ротамі, у якіх з тылу дастаўлялася ў дзеючую армію спешна падрыхтаванае, дрэнна абучанае і не жадаўшае ваяваць папаўненне. Усе крыніцы менавіта гэтую прычыну паказваюць



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

як першую сярод вытокаў бязладдзя і дэмаралізацыі рускага войска [5, с. 344; 6, с. 201, 209, 225]. Іншымі носьбітамі разладу і дэмаралізацыі ў дзеючай арміі былі салдаты, якія вярнуліся з водпускаў [12, с. 74]. І тыя, і другія рабіліся рассаднікамі антываенных і нават паражэнчых настрояў у войску. Ужо пасля першых няўдач на фронце ваенныя ўлады адзначалі пашырэнне такіх настрояў: “Хутчэй бы немцы ўзялі Петраград...”; “няхай Германія пераможа, за тым царом будзе лепей жыць” [13, с. 141], і г. д. Характэрна, што іх выяўлялі тыя ж самыя салдаты-сяляне, якія падчас мабілізацыі летам 1914 г. спявалі прыпеўкі: “Мы сначала возьмём Краков, а потом уже Берлин…” І тлумчылі, для чаго: “Налогом обведём” [14, с. 113]. У святле гэтых фактаў лёгка зразумець, што Беларусь (Паўночна-Заходні край імперыі) была чужая для рускіх салдат, яна была краем, за які няварта было цярпець пакуты і рызыкаваць жыццём. “Мы вяцкія, тульскія, пермскія, да нас немец не дойдзе”, [5, с. 293] – так салдаты з карэннай Расіі выражалі сваё стаўленне да вайны, стаўшай для іх неспадзявана цяжкай і бессэнсоўнай.

Нежаданне ваяваць пасля летніх няўдач 1915 г. вылілася ў масавае дэзерцірства салдат з фронта, набыўшае найбольшы размах у раёнах Паўночнага і Заходняга франтоў. Па Дзвінскай ваеннай акрузе ўжо ў канцы 1915 г. штотыдзень затрымлівалася ў сярэднім 462 дэзерціры, праз год – 1479, і далей захоўвалася тэндэнцыя росту іх колькасці [12, с. 80]. Няўхільна адбывалася крыміналізацыя гэтай масы. Такім чынам, не здолеўшы абараніць тэрыторыю Беларусі і яе насельніцтва ад знешняга ворага, салдаты самі стваралі небяспеку для гэтага краю. Аднак эвалюцыя расійскага войска ў гэтым накірунку пачалася раней і мела не стыхійны характар. Яна пачалася з пераходу Вярхоўнага галоўнакамандавання да выкарыстання тактыкі “выпаленай зямлі” пры адступленні з Польшчы і Заходняй Беларусі летам 1915 г. Насельніцтва гэтых тэрыторый, дзе добраахвотна, хоць і пад уплывам антыгерманскай прапаганды, а дзе і гвалтам высялялася ваеннымі і грамадзянскімі ўладамі, яго маёмасць і пасевы знішчаліся, коні і буйная рагатая жывёла, транспартныя сродкі рэквізаваліся, іншыя матэрыяльныя каштоўнасці знішчаліся або вывозіліся ў тыл [15, с. 95–96]. Гэта арганізаванае зверху вынішчэнне плёну працы многіх пакаленняў спрыяла пашырэнню стыхійнага рабаўніцтва мясцовага насельніцтва адыходзіўшымі на ўсход расійскімі вайскоўцамі. З мноства сведчанняў на гэты конт выберам назіранні ваеннага ўрача Л. Вайталоўскага, які ў верасні 1915 г. запісаў: ”П’яныя палкі і дывізіі пераўтвараюцца ў банды марадзёраў і на ўсім сваім шляху ўчыняюць рабункі і пагромы.” Пры гэтым казакі, здаўна прывыкшыя глядзець на вайну як на сродак здабычы, вылучаліся

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

найбольшай жорсткасцю. “Асабліва шалеюць казакі, – працягваў той жа аўтар. – Не шкадуючы ні полу, ні ўзросту, яны абдзіраюць да ніткі ўсе вёскі і пераўтвараюць у разваліны яўрэйскія мястэчкі” [16, с. 35].

Але гэта быў толькі пачатак. Да восені 1917 г. войскі 1,5-мільённага расійскага Заходняга фронта пераўтварыліся ва ўзброеную масу рабаўнікоў, якая займалася пагромамі цывільнага насельніцтва, не спыняючыся перад забойствамі людзей, незалежна ад іх полу і ўзросту. “Ідзе пагалоўнае рабаўніцтва сялян на фронце”; “выразаюць сялянскія сем’і”, – з трывогай адзначалі дэлегаты Усебеларускага з’езда [17, с. 68]. Усведамленне гэтай з’явы як паўсядзённай і тыповай для расійскага войска на працягу апошніх месяцаў яго знаходжання на беларускай зямлі адкрывае настолькі жудасную старонку Першай сусветнай вайны, што беларускія гісторыкі не адважваюцца пісаць аб ёй і сёння. Але гаварыць і пісаць неабходна, як ні шаблонна гэта гучыць, дзеля пазнання гістарычнай праўды – не толькі праўды аб самой “вялікай” вайне, але і аб умовах фарміравання звязанага з ёю нацыянальнага руху і беларускай дзяржаўнасці.

*3. Бежанцы: “знайшлі сваю нацыю”*

Часткай гэтай трагічнай праўды з’яўляецца праўда аб бежанстве – з’яве Першай сусветнай вайны, якая хоць і вывучаецца беларускімі і расійскімі гісторыкамі [18], але ўсе грані якой яшчэ не выяўлены, а маштабы недастаткова ўсвядомлены. Відавочна, што бежанства не ўзнікла стыхійна. Яно была вынікам адпаведнай палітыкі расійскіх уладаў [19], якія на пачатку вайны прапагандысцкімі сродкамі сфарміравалі ў насельніцтва ірацыянальны, выклікаўшы панічны страх вобраз наступаўшых немцаў, а затым перайшлі да гвалтоўнага высялення людзей з роднай зямлі на ўсход. Гэты шлях быў пазначаны мноствам магіл пахаваных на скорую руку дзяцей і старых. Разам з тым, асудзіўшы вялізныя масы беларусаў на фізічныя і маральныя пакуты, пераўтварыўшы для іх смерць у будзённую з’яву [20, с. 240 – 241], трагедыя бежанства дала ім новы і важны вопыт, расшырыла іх кругагляд, паскорыла фарміраванне нацыянальнай свядомасці. “Вопыт бежанства стаў для беларусаў адным з самых значных за ўсю іх гісторыю, поўным найцяжэйшых выпрабаванняў, страт і, як вынік, пачаткам каласальнага, амаль што выбуховага, масавага этнасацыяльнага прасвятлення…” [21, с. 1]. Апынуўшыся сярод рускіх людзей, многія тысячы беларусаў усвядомілі сваю іншасць – “знайшлі сваю нацыю” [22, с. 217], як вызначыў гэты працэс Мікалай Улашчык. Прычым, на гэтую іншасць указала ім мясцовае насельніцтва, не прызнаўшае ў беларусах рускіх – ні па мове, ні па звычаях, ні па вопратцы.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Але сапраўдныя праблемы пачаліся пазней, пасля першых цёплых хвілін сустрэчы бежанцаў, калі выяснілася, што іх з'яўленне ў глыбіннай Расіі абвастрае цяжкасці з забеспячэннем мясцовага насельніцтва хлебам, жыллём, працай, і што яны нават разлічваюць на кавалак зямлі для ўтрымання сваіх сем'яў. Рускія сяляне і рабочыя, нярэдка пры падтрымцы мясцовай улады, пачалі выцясняць канкурэнтаў усімі спосабамі, даходзячы да разбурэння печаў і выдзірання вокан у іх жыллі [23, с. 110; 24, с. 79]. Расійскія даследчыкі бежанскай праблемы паказалі, што такая драматычная сітуацыя склалася задоўга да прыходу бальшавікоў да ўлады [25], з палітыкай якіх звязвалі пагаршэнне становішча бежанцаў асобныя беларускія гісторыкі. Па ацэнцы “Дзянніцы”, органа Белнацкама, гэта сітуацыя прымушала бежанцаў-беларусаў дамагацца вяртання на радзіму, пад уладу нямецкага шуцмана, каб толькі не існаваць далей у такіх невыносных умовах [26]. На сваю спустошаную вайной радзіму яны вярталіся ўжо іншымі людзьмі, ясна ўсвядоміўшымі, кім яны з'яўляюцца.

*4.Усебеларускі з'езд: “Будаваць сваю хату”*

Што датычыць тых беларускіх сялян, якія засталіся на неакупіраванай тэрыторыі Беларусі, то пасля Лютаўскай рэвалюцыі іх светапогляд і грамадскія паводзіны развіваліся больш складаным шляхам. На іх шлях да сваёй нацыі працягвалі ўплываць яшчэ даваенныя спадзяванні атрымаць зямлю за кошт “польскіх” памешчыкаў краю, хоць цяпер гэтыя спадзяванні звязваліся з абяцанымі Часовым урадам выбарамі ў Устаноўчы сход. Калі мы кінем погляд на паводзіны беларускага сялянства падчас выбараў у перадваенныя расійскія Дзяржаўныя Думы, то заўважым, што гэтыя паводзіны былі матываваныя якраз спадзяваннямі сялян і іх прадстаўнікоў у II – IV Думах на правядзенне ўрадам аграрнай рэформы, у выніку якой яны б набылі зямлю ў прыватную ўласнасць [27, с. 284, 288] . А галоўным землеўласнікам у Беларусі, як вядома, быў польскі (ці спольшчаны) памешчык. Такім чынам, беларускія сяляне аб'ектыўна і суб'ектыўна – у прамовах сваіх дэпутатаў у Думе – выступалі як саюзнікі царызму ў барацьбе з польскім землеўладаннем, дазваляючы расійскім правым маніпуліраваць сабою. Па гэтай жа прычыне дэпутаты ад сялянскай курыі з беларуска-літоўскіх губерняў выступалі супраць увядзення шырокага мясцовага самакіравання (аўтаноміі). Яны баяліся, што памешчыкі, захапіўшы ў свае рукі самакіраванне краю, не дазволяць затым правесці ў жыццё аграрную рэформу ў інтарэсах сялянства. У гэтай сітуацыі беларускай адраджэнскай інтэлігенцыі яшчэ і пасля Лютаўскай рэвалюцыі цяжка было пераканаць сялян у неабходнасці

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

аўтаноміі для Беларусі, а расійскім чарнасоценцам, наадварот, лёгка было прадставіць адраджэнцаў у якасці інструмента “польскай інтрыгі” ў краі.

Аднак ужо ад пачатку вайны паводзіны “саюзніка” – царызму – у дачыненні да сацыяльнага антаганіста беларускіх сялян пачалі насцярожваць іх. Пад пагрозай страціць Польшчу тэрытарыяльна і ў палітычных адносінах царызм пачаў палітычную гульню з польскім памешчыцкім класам. 14 жніўня 1914 г. была абвешчана заява Вярхоўнага галоўнакамандуючага, вялікага князя Мікалая Мікалаевіча, аб тым, што пасля вайны Расія можа прызнаць аўтаномію Польшчы ў межах Расійскай імперыі. Неўзабаве пачаліся крокі па стварэнні польскага войска, яго першыя аддзелы з’явіліся на беларускай зямлі [28, с. 158–169]. Хоць Лютаўская рэвалюцыя скінула царызм, але пачатая ім польская палітыка на новай ідэалагічнай аснове працягвалася Часовым урадам. К восені 1917 г. быў створаны Першы польскі корпус пад камандаваннем генерала Ю. Доўбар-Мусніцкага, дыслакаваны ў шэрагу месц Усходняй Беларусі. Сам па сабе гэты факт, магчыма, і не надта б усхваляваў беларускіх сялян, але 22 кастрычніка на з’ездзе вайскоўцаў-палякаў корпус атрымаў заданне абараняць культурную спадчыну і маёмасць мясцовага польскага насельніцтва [29, s. 50]. А гэта ўжо быў замах супраць аграрнай рэформы, якой да таго часу цярпліва чакалі беларускія сяляне. З’яўленне ўзброенай сілы, гатовай абараняць інтарэсы польскіх памешчыкаў, следам за канфузным вынікам летняга “наступлення” войск Заходняга фронта, дазволіў зразумець беларускаму сялянству, што на падтрымку расійскай дзяржавы ў рашэнні зямельнага і іншых жыццёва важных для яго пытанняў разлічваць болей не даводзіцца.

Пачатак павароту ў настроях беларускага сялянства ў бок “будаўніцтва сваёй хаты” пераважна ўласнымі сіламі неабходна бачыць, на нашу думку, у двух фактах, якія адносяцца да канца лета – пачатку восені 1917 г.: у зрыве хлебнай манаполіі, устаноўленай Часовым урадам [30, с. 17] (сяляне адмаўляліся карміць няздольнае абараніць краіну войска) і ў прыняцці беларускімі арганізацыямі курсу на стварэнне беларускага войска [31, с. 58]. Што да першага факта, то яго лягчэй звязаць з эканамічнымі інтарэсамі сялян, як гэта робіць беларускі даследчык [30, с. 13, 17], але нельга недаацэньваць і расчаравання вяскоўцаў у абарончай палітыцы новага расійскага ўрада, якая аказалася не болей эфектыўнай, чым палітыка царскага ўрада. Больш за тое: катастрафічныя вынікі летняга “наступлення”, бегства рускіх саладат з фронта, якое неўзабаве пачалося, засведчылі,

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

што рускі народ не хоча ваяваць за вяртанне заходніх тэрыторый сваёй дзяржавы, а новы ўрад няздольны яго прымусіць. А тым часам пры падтрымцы таго ж урада з'явіўся новы прэтэндэнт на беларускую зямлю, прадстаўлены Першым польскім корпусам і польскімі грамадскімі арганізацыямі як яго сацыяльнай апорай. Беларускі народ заставаўся сам на сам з гэтымі праблемамі, што і прымусіла нацыянальныя арганізацыі заняцца стварэннем беларускага войска. Першыя крокі ў адпаведным накірунку супалі з новым палітычным пераваротам у Расіі – прыходам бальшавікоў да ўлады – і далей развіваліся ў створаных гэтым пераваротам умовах.

Але названыя прычыны не вычэрпвалі матываў, пабуджаўшых беларускія арганізацыі ўзяцца за стварэнне нацыянальнага войска. На Усебеларускім з'ездзе ў снежні 1917 г. ў ліку такіх матываў з аднолькавым перакананнем указвалася на неабходнасць не дапусціць канчатковага разарэння краю расійскім войскам, якое развальвалася, забяспечыць абарону сялян ад прыхільнай памешчыкам польскай узброенай сілы і на неабходнасць падтрымліваць бяспеку на выпадак стыхійнага вяртання на радзіму бежанцаў [17, №1, с. 62–69; №2, с. 46–55; №3, с. 61–69; № 4, с. 50–61]. Усе тры акцэнтаваныя на з'ездзе задачы вынікалі з агульнай ацэнкі нацыянальнымі арганізацыямі сітуацыі, што склалася ў Беларусі пасля трох гадоў вайны, як трагічнага выніку "расійскага бязладдзя", ад якога неабходна шукаць паратунак. Войска як адзін з інструментаў улады разглядалася як сродак самаабароны беларускага народа і яго выйсця з трагічнай сітуацыі, створанай імперыялістычнай вайной і выяўленым ёю бязладдзем. Менавіта ў гэтай форме – *як ідэя нацыянальнага ўратавання* – беларуская нацыянальная ідэя аказалася зразумелай і хутка пашыралася ў масах у апошнія месяцы 1917 і на пачатку наступнага года [32].

Эвалюцыя свядомасці беларускага сялянства ў нацыянальным духу *ўпершыню ў гісторыі адкрывала перспектыву пераўтварэння беларускага руху ў масавы*. У гэтай сувязі звернем увагу на тое, што адным з ініцыятараў правядзення Усебеларускага з'езда – рубежнай падзеі ў працэсе самавызначэння беларускага народа – была арганізацыя, выступаўшая ад імя беларускага сялянства – Беларускі абласны камітэт пры Усерасійскім савеце сялянскіх дэпутатаў. З'езд адбыўся пры падтрымцы, уключаўшай і фінансавую, мясцовых земскіх арганізацый і Сялянскага саюза [33, л. 22, 23] , сяляне складалі значную частку яго ўдзельнікаў. Хоць яны займалі на з'ездзе найбольш памяркоўную і няўстойлівую пазіцыю, але здзіўляе не гэта. Уражвае іх масавы ўдзел у гэтым *нацыянальным* форуме, што яшчэ за



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

паўгода да з’езда немагчыма было ўявіць. Заўважым у гэтай сувязі, што на скліканы Беларускім нацыянальным камітэтам агульнакраёвы сялянскі з’езд у красавіку 1917 г. з’явіліся толькі 52 дэлегаты, а на Мінскім губернскім, які ў тым жа месяцы правялі бальшавікі, было прадстаўлена звыш 800 дэлегатаў ад сялян, і прайшоў ён у антыбеларускім духу [3, с. 125–127].

Відавочна, што ні аб’ектыўныя, ні суб’ектыўныя прычыны, якія перашкаджалі скліканню Усебеларускага з’езда, не здолелі істотна знізіць прадстаўнічасць гэтага агульнабеларускага форуму.

Гэта ацэнка будзе тым больш пераканаўчай, калі мы заўважым, што восенню 1917 г. рознага роду выбары і з’езды ішлі адзін за другім, а то і супадаючы ў часе. Адбывалася пакутлівае пераўтварэнне мас людзей з аб’екта палітыкі ў яе суб’ект. У гэтым патоку палітызацыі насельніцтва ішло выдзяленне і пашырэнне беларускай нацыянальнай плыні. Параўнанне колькасных параметраў Усебеларускага з’езда з такімі ж параметрамі іншых з’ездаў, што ўтваралі гэты паток, дасць нам лепшае ўсведамленне працэсу фарміравання ў ім гэтай плыні. Мэтазгодна ўзяць для параўнання тыя *тры з’езды,* якія мінскія бальшавікі правялі з мэтаю легалізацыі сваёй улады ў краі і адначасова дзеля ўмацавання ўладных пазіцый напярэдадні выбараў ва Устаноўчы сход. Першы з гэтых з’ездаў – 3-ці з’езд сялянскіх дэпутатаў Мінскай і Віленскай губерняў – праходзіў 18–20 лістапада. Адпаведна з паведамленнем газеты “Звезда”, адна з пастаноў з’езда зафіксавала лічбу ў 335 яго ўдзельнікаў [34, с. 235]. 20–25 лістапада прайшоў 2 з’езд армій Заходняга фронта, які быў больш прадстаўнічым, што і зразумела, паколькі менавіта салдаты фронту былі галоўнай апорай бальшавікоў у краі. У дзень яго адкрыцця на з’ездзе прысутнічала 450–500 чалавек, у наступныя дні, калі меркаваць па справаздачы той жа “Звезды”, колькасць яго ўдзельнікаў вагалася ад 310 да 633 чалавек [34, с. 244, 266, 274]. Відавочна, салдаты-дэпутаты аказаліся не надта дысцыплінаванымі. Але найбольшы клопат мінскія бальшавікі мелі са з’ездам саветаў рабочых і салдацкіх дэпутатаў Заходняй вобласці. “Звезда” не здолела назваць колькасць яго ўдзельнікаў, былі пералічаныя толькі прадстаўленыя на з’ездзе саветы, якіх аказалася 16 [34, с. 236]. Гэта была прыкладна трэцяя частка ўсіх існаваўшых у Беларусі на момант бальшавіцкага перавароту саветаў рабочых і салдацкіх дэпутатаў разам з агульнымі саветамі рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў [35, с. 183]. Бальшавікам на з’ездзе быццам бы належала дзве трэці месцаў, астатнія – левым эсэрам [36, с. 159]. *Выходзіць, што Усебеларускі з’езд у першыя дні сваёй працы па колькасных*



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

*паказчыках пераўзыходзіў скліканы бальшавікамі сялянскі з'езд і быў блізкі да франтавога з'езда, а ў апошнія дні працы пераўзыходзіў усе тры гэтыя з'езды.* Што датычыць тэрытарыяльнага і сацыяльнага прадстаўніцтва, то з'езд меў поўнае права назваць сябе ўсебеларускім, бо прадстаўляў усе рэгіёны Беларусі, у тым ліку дзякуючы ўдзелу бежанцаў – і акупаваную заходнюю частку краю, а таксама і ўсе яго сацыяльныя слаі [3, с. 178–179].

Варта звярнуць увагу на яшчэ адну акалічнасць, звязаную з Усебеларускім з'ездам, – на той гістарычны момант, калі беларускія арганізацыі выбіралі сваіх дэлегатаў на з'езд, і на тыя лозунгі, пад якімі выбары праводзіліся. Яны праходзілі літаральна назаўтра пасля выбараў ва Устаноўчы сход, з якімі масы людзей на працягу некалькіх месяцаў звязвалі свае спадзяванні на замацаванне ў законах ужо праведзеных рэвалюцыйных пераўтварэнняў, у прыватнасці перадачы зямлі зямельным камітэтам для яе раздзелу паміж сялянамі, і іншых. Здавалася б, што яшчэ можна было выбіраць? Тым не менш, многія тысячы людзей не палічылі лішнімі выбары на беларускі з'езд, папярэдняя праграма якога была намечана ў звароце Вялікай Беларускай Рады (ВБР) да сялянскіх саветаў, гарадскіх і земскіх самакіраванняў ад 18 лістапада 1917 г. "З'езд гэты павінен выявіць волю народа беларускага, які не можа і не жадае далей абыякава адносіцца да свайго лёсу ў цяперашні небяспечны і адказны момант. З'езд павінен абмеркаваць і вызначыць усе магчымасці самаабароны шматпакутнага беларускага народа і прыняць меры для яе самаарганізацыі", – гаварылася ў звароце. Выбаршчыкі галасавалі за ўдзел у з'ездзе, на парадак дня якога прапанаваліся наступныя пытанні: "1. Міжнароднае становішча Беларусі (вайна і мір). 2. Зямельнае пытанне. 3. Будучае палітычнае ўладкаванне Беларусі. 4. Стварэнне органа краёвай улады" [33, л. 22 - 23; 37, с. 101]. *Такім чынам, дэлегаты з'езда адпраўляліся ў Мінск, усведамляючы свае задачы як паўнамоцных прадстаўнікоў беларускага народа*, а найбольш дасведчаныя з іх глядзелі на маючы адбыцца з'езд як на Беларускі Устаноўчы сход (ці Ўстаноўчы сойм) [38, с. 222, 223, 225, 227].

Нягледзячы на разгон з'езда бальшавікамі, асваенне беларускімі масамі ідэі беларускай дзяржаўнасці не было спынена. Аб гэтым сведчыць, з аднаго боку, даверлівае стаўленне насельніцтва акупіраванай немцамі Беларусі да Беларускай Народнай Рэспублікі (БНР) [39, с. 371–383], а з другога – настойлівая прапаганда ідэі аб стварэнні ўрада "са сваіх людзей" беларускімі дзеячамі і арганізацыямі на тэрыторыі Савецкай Расіі [40; 26, 1919. 8 лютага].

Калі гаварыць пра БНР, то давядзецца з жалем канстатаваць, што нават у асяроддзі прафесійных гісторыкаў не пераадолены



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

прынцыпова антынацыянальны ідэалагічны падыход да яе гісторыі. А іншыя ў шчырай наіўнасці папракаюць яе заснавальнікаў (Раду БНР) у тым, што, абвясціўшы незалежнасць Беларусі, яны адыйшлі ад рашэнняў Усебеларускага з’езда, якім дэкларавалася толькі аўтаномія Беларусі ў складзе Расійскай дэмакратычнай федэрацыі (заўважым: яшчэ не існаваўшай). Але такім прыхільнікам юрыдычнай чысціні беларускага нацыянальнага руху неабходна было б заўважыць, што рашэнне Рады БНР аб незалежнасці было прынята на якасна іншым этапе развіцця, у новых гістарычных умовах, якім рашэнне Усебеларускага з’езда аб аўтаноміі ўжо не адпавядала. У гэтай сувязі напрошваецца не адно пытанне да іх. Возьмем хоць бы гэта: а якую вы бачыце альтэрнатыву прынятаму 25 сакавіка рашэнню?

Пасля расшырэння ў лютым нямецкай акупацыі да самага Дняпра беларускія сяляне такой альтэрнатывы не бачылі. Так, яны браліся за зброю дзеля абароны свайго дабра і сваёй годнасці ад самаволі акупантаў, але разам з тым пасылалі шматлікія хадайніцтвы да органаў БНР аб іх заступніцтве перад акупантамі [39, с. 371–383]. Гэта азначала, што яны бачылі ў БНР сваю ўладу, сёння было б дакладней сказаць – беларускую протадзяржаву, якую гатовы былі прыняць пасля сыходу акупантаў. Ужо ў 1918 г. для беларускага народа ўзнікла сітуацыя барацьбы на два франты: спачатку імі былі польскі корпус генерала Доўбар-Мусніцкага і бальшавікі, а затым – германскія акупанты і тыя ж бальшавікі на ўсходзе Беларусі. У той самы час, калі на акупіраванай германцамі тэрыторыі рознымі спосабамі – мірнымі і намірнымі – вялася барацьба супраць акупантаў, уся Усходняя Беларусь была ахоплена антысавецкімі сялянскімі паўстанняі. Гэта сітуацыя сведчыць аб тым, што беларускія сяляне змагаліся не за вяртанне савецкай улады на месца германскай акупацыйнай, а за сваё права жыць мірна і сваім жыццём, са сваёй уладай.

Разам з тым, канстатуючы эвалюцыю беларускага сялянства на нацыянальныя пазіцыі, неабходна ўсведамляць, што на працягу некалькіх вызначальных для ўсяго руху гадоў яна стрымлівалася істотнымі аб’ектыўнымі фактарамі. Гэта эвалюцыя ішла двума геаграфічна аддзеленымі адзін ад другога патокамі – бежанскім і мясцовым – і адчувала на сабе ўплыў незавершанай барацьбы сялян за зямлю. Павольнае злучэнне двух патокаў у адзін пачалося пасля падпісання Савецкай Расіяй і Германіяй Брэсцкага міру, калі пачалі вяртацца ў Беларусь бежанцы з Расіі. Аднак праз кароткі час пасля завяршэння Першай сусветнай вайны Беларусь была зноў падзелена, на гэты раз фронтам польска-савецкай вайны, і кожны паварот польска-савецкай барацьбы зноў абвастраў зямельнае пытанне для



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

беларускага селяніна. Ёсць падставы сцвярджаць, што беларускія сяляне гатовыя былі прыняць толькі тую ўладу, якая забяспечыць іх зямлёй за кошт мясцовага польскага памешчыка. А ўладу бальшавікоў-“чужаніц”, якая праводзіла дактрынёрскую сацыялістычную палітыку ў вёсцы, яны прыняць не маглі.

*5. Альтэрнатывы беларускага дзяржаватварэння падчас завяршэння польска-савецкай вайны*

Беларускія сяляне пакутліва працярэблівалі шлях да свайго нацыянальнага самаўсведамлення. Як адзін з паваротаў гэтага шляху, шляху беларускага сялянства да нацыі, неабходна разглядаць і палескі паход С. Булак-Балаховіча восенню 1920 г. Як вядома, ён пачаўся праз некалькі тыдняў пасля заключэння Савецкай Расіяй і Польшчай папярэдняга міру, тады, калі ў чарговы раз “чужаніцы” вырашалі лёс Беларусі. 25 кастрычніка генерал разам з членамі Беларускага Палітычнага Камітэта (БПК) перайшоў устаноўленую мірным дагаворам прэлімінарную граніцу, а 7 лістапада ў Тураве сімвалічна перадаў БПК палітычную ўладу над вызваленай тэрыторыяй (даслоўна) “Беларускай Народнай Рэспубліцы”. Але большасць тэрыторыі гэтай рэспублікі яшчэ толькі належала вызваліць. Ацэньваючы шансы генерала рашыць гэту задачу, варта звярнуць увагу на два з іх. Паход пачынаўся ў перыяд, калі ў Савецкай Расіі цярпела крах палітыка ваеннага камунізму, што выяўлялася ва ўзнікненні ў тыле Чырвонай Арміі *трэцяга фронта* (пасля польскага і врангелеўскага) – *масавай узброенай барацьбы сялян супраць савецкай улады.* Размах гэтай барацьбы быў настолькі магутным, што Ленін палічыў сялянства больш небяспечным ворагам, чым Юдзеніч, Калчак і Дзянікін, разам узятыя. Сяляне ўцягнуліся ў гэтую барацьбу пад цяжарам “продразвёрсткі” і прамых рэквізіцый жыўнасці, фуражу, харчоў на карысць Чырвонай Арміі. Да таго ж яны бачылі няздольнасць савецкай улады наладзіць забеспячэнне вёскі соллю, газай, іншымі неабходнымі таварамі. У гэтай сітуацыі сяляне адмаўляліся дапамагаць Чырвонай Арміі, а мабілізаваныя ў яе рады ў масавым парадку дэзерціравалі. Гэту з’яву старшыня Камаровіцкага валаснога ваенрэўкама назваў “эпідэмічнай хваробай балахоўшчынай”, бо значная частка дэзерціраў пасля з’яўлення Балаховіча на Мазырскім Палессі перайшла на яго бок [41, л. 88 адв. – 89]. Такім чынам, органы савецкай улады ацэньвалі Булак-Балаховіча як саюзніка беларускіх сялян у барацьбе супраць савецкай улады, і сам ён прэзентаваў сябе ў гэтай ролі [42]. Наяўнасць такога саюзніка складала першы шанс, на які мог разлічваць генерал, і на які, відавочна, ён і разлічваў.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Але ў беларускім сялянстве Булак-Балаховіч меў саюзніка *супраць* – супраць савецкай улады, – а яму, як чалавеку, што адважыўся ўзняць зброю *за* стварэнне Беларускага Гаспадарства [42], патрэбны быў саюзнік дзеля рэалізацыі гэтай *ствральнай мэты*. Ці было такім саюзнікам беларускае сялянства?

Усведамляючы недастатковую даследаванасць гэтага пытання, тым не менш, наважымся сцвярджаць, што так, сялянства, *хоць бы аб'ектыўна,* было саюзнікам "бацькі Балаховіча". Да такога сцвярджэння прыводзяць назіранні за эвалюцыяй светапогляду і сацыяльнай актыўнасці беларускага сялянства на працягу шасці ваенных гадоў (1914–1920). Нацярпеўшыся пры розных уладах – царскай, Часовага ўрада, бальшавіцкай, нямецкай, польскай – сяляне Беларусі, як і ўсходнепалескага яе рэгіёна, пачалі звязваць свае спадзяванні на лепшае са сваёй, беларускай уладай. На тэрыторыі, якая засталася пад савецкім кантролем пасля падпісання прэлімінарнага мірнага дагавора, адпаведныя настроі выяўляліся пры кожнай сустрэчы прадстаўнікоў улады з сялянамі. "Ці будзе Беларусь самастойнай [пасля вайны]? А калі яна будзе самастойнай, дык ці будзе ў ёй савецкая ўлада і савецкае войска?" – пыталіся дэлегаты беспартыйнай канферэнцыі, арганізаванай Камаровіцкім ваенрэўкамам [43, л. 5]. А ў Мінскім павеце арганізатары валасных рэўкамаў сабралі цэлы спіс падобных пытанняў. Іх квінтэсенцыю можна ўбачыць у наступнай канстатацыі, прыведзенай у дакладзе аб выніках гэтай работы: "Насельніцтва некаторых валасцей, даведаўшыся аб самавызначэнні Беларусіі, не хоча прызнаваць ніякай улады, акрамя неіснуючага ўрада "незалежнай Беларусі", і адносіцца вельмі варожа да арганізуемых валрэўкамаў, заяўляючы, што рэўкамы трэба выбіраць, а не прызначаць з Масквы" [44, л. 81а].

Такім чынам, мы можам сцвярджаць, што палескі паход С. Булак-Балаховіча пад сцягам стварэння беларускай нацыянальнай дзяржавы не быў безнадзейнай акцыяй. Але высняць, чаму ён не прывёў да поспеху – гэта прадмет іншага даследавання [45]. Тут мы абмяжуемся сцвярджэннем, што адну задачу, хоць і не запланаваную ні Булак-Балаховічам, ні БПК, ён аб'ектыўна выканаў. Гэты паход паслужыў яшчэ адным, побач з дыпламатычнай дзейнасцю ўрада БНР (урада Вацлава Ластоўскага), сродкам націску на маскоўскія і беларускія савецкія ўлады ў накірунку стварэння Беларускай савецкай рэспублікі, якая пасля яе другога абвяшчэння ў канцы ліпеня 1920 г. заставалася ў зародкавым і няпэўным стане.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

### 6. *Што засталося ў спадчыну*

Зноў абвешчаная БССР не выпадкова амаль на паўгода як бы “завісла” ў паветры. Яе другое абвяшчэнне было звязанае са спробай бальшавіцкага ўрада “перанесці на штыхах” рэвалюцыю ў Польшчу, каб затым прыступіць да саветызацыі Усходняй Еўропы, ад Прыбалтыкі да Румыніі, а ў спрыяльнай для бальшавікоў сітуацыі – і больш шырокага яе абсягу [46, с. 219–240]. Абвяшчэнне Беларускай савецкай рэспублікі, з аднаго боку, служыла сродкам забеспячэння прадполля і тылу для гэтага паходу, а з другога – мусіла сведчыць працоўным Польшчы і Заходняй Еўропы аб адсутнасці ў савецкага ўрада імперыялістычных намераў. Няўдача паходу Чырвонай Арміі ў Польшчу змяніла ролю, адведзеную Савецкай Беларусі ў палітыцы РСФСР. Цяпер яна мусіла служыць картай у дыпламатычнай гульні савецкага ўрада ў ходзе мірных перагавораў, да часу прыхаванай і прыдатнай для выкарыстання ў залежнасці ад сітуацыі. Валоданне гэтай картай было забяспечана рашэннем ВРК БССР аб прызнанні за Савецкай Расіяй права весці перагаворы з Польшчай аб польска-савецкай мяжы на тэрыторыі Беларусі. Атрымаўшы яго, маскоўскія інстанцыі праз Рэўваенсавет Заходняга фронту прыпынілі працэс канстытуіравання Беларускай савецкай рэспублікі. Атрыманы мандат, з аднаго боку, даваў савецкаму ўраду сродак палітычнага гандлю ў адносінах з Варшавай, дазваляючы яму быць цвёрдым на ўкраінскім участку лініі фронту і саступлівым – на беларускім участку. З другога боку, ён ствараў аргумент для адхілення патрабавання ўрада БНР аб удзеле ў мірнай канферэнцыі – маўляў, ужо ёсць іншы беларускі ўрад – савецкі, ці эвентуальна дазваляў супрацьпаставіць першаму фіктыўны беларускі савецкі ўрад, калі б гэта патрабаванне падтрымала Польшча. А імавернасць яго падтрымкі існавала ў той ступені, у якой мела шанцы на рэалізацыю федэратыўная канцэпцыя польскай усходняй палітыкі. Пры ўсіх гэтых варыянтах БССР заставалася толькі інструментам палітыкі Масквы на заходнім накірунку, які выкарыстоўваўся з тымі ці іншымі мэтамі ў залежнасці ад сітуацыі. Гэты інструмент, аднак, быў дастаткова значным, каб згадзіцца на *яго трансфармацыю з органа ваеннага кіраўніцтва часткай беларускай тэрыторыі ў форму нацыянальнай аўтаноміі.* Першы крок у гэтым накірунку быў зроблены рашэннямі II з’езда саветаў Беларусі, які быў скліканы ў Мінску 13 снежня 1920 г., а наступны – заключэннем 16 студзеня 1921 г. “Дагавора аб ваенным і гаспадарчым саюзе паміж РСФСР і БССР” [47, с. 222–223, 243–244].

Нельга не заўважыць, што ўвесь час, пакуль ішлі польска-савецкія мірныя перагаворы, так моцна паўплываўшыя на лёс



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Беларусі і, у прыватнасці, на яе савецкую квазідзяржаўнасць, за плячыма іх удзельнікаў нябачна знаходзіўся ўрад БНР, які з'яўляўся, у прынцыпе, носьбітам альтэрнатывы польска-савецкаму падзелу Беларусі. Ва ўмовах, якія на той момант склаліся, шанцы на рэалізацыю гэтай альтэрнатывы былі невялікія (хаця наколькі невялікія – гэта пытанне неабходна вывучаць асобна). Не здолеўшы ўратаваць Беларусь ад падзелу, урад БНР, аднак, уратаваў беларускую савецкую квазідзяржаву, ствараючы ўмовы для яе нараджэння ў той адзінай ролі, якая была для яе магчымай – у ролі інструмента савецкай палітыкі.

Правераная ў перыпетыях 1920 г. эфектыўнасць беларускага палітычнага інструмента прымушала яго стваральнікаў – вышэйшыя ўлады Савецкай Расіі - мірыцца з некаторымі яго "нязручнасцямі", якія з часам выявіліся. Як аб'ектыўна, так і ў спадзяваннях беларускіх нацыянал-камуністаў, "інструмент" служыў сродкам прыцяжэння да нацыянальнага палітычнага цэнтра беларускай этнічнай тэрыторыі не толькі з захаду, але і з усходу. Ён пастаянна "напамінаў" насельнікам савецкай Беларусі, што з'яўляюцца – па назве краіны – беларусамі. Інакш гаворачы, спрыяў нацыянальнай самаідэнтыфікацыі.

З крывавых перыпетый 1917–1920 гадоў беларускі народ выйшаў з яшчэ адным істотным набыткам. Савецкаму ўраду давялося адкласці на 10 год суцэльную калектывізацыю беларускага сялянства, да якой бальшавікі з Літоўска-Беларускай ССР прыступалі ўжо ў 1919 г. Гэты непасрэдны вынік беларускага нацыянальнага руху 1917–1920 гг. да гэтага часу не быў заўважаны беларускімі гісторыкамі. А між тым адпаведнае пытанне было пастаўлена поруч з пытаннем аб канстытуіраванні БССР на Другім Усебеларускім з'ездзе саветаў у снежні 1920 г. і вырашана адпаведна з інтарэсамі беларускага сялянства. На з'ездзе было пастаноўлена дзеля заваявання сялянства на бок савецкай улады (менавіта такой была матывацыя) адмовіцца ад палітыкі суцэльнай саветызацыі былога памешчыцкага і манастырскага землеўладання і не менш чым дзве траціны гэтай зямлі да вясны перадаць сялянам [48, л. 38]. У выніку беларускае сялянства забяспечыла сабе пэўны запас трываласці перад будучым франтальным наступленнем супраць яго антысялянскай бальшавіцкай улады.

Беларускі нацыянальны рух так і не здолеў стварыць рэальную поўнацэнную дзяржаву, хоць і ўступіў у адпаведную стадыю, дзе ён быў прадстаўлены дзвюма формамі – БНР і БССР. Але замацавацца на гэтай стадыі і напоўніць хоць бы адну са створаных форм рэальным зместам ён, па розных прычынах, не здолеў, і быў адкінуты назад у сваім развіцці. Але гэтае адкідванне, гэтае яго паражэнне,



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

матэрыялізаванае ў рыжскім падзеле 1921 г., не здолела вярнуць яго да ўзроўню, які ён меў напярэдадні "вялікай вайны" 1914–1918 гг. Калі зноў выкарыстаць стадыяльную характарыстыку, то можна меркаваць, што на працягу наступных амаль 20 гадоў беларускі нацыянальны рух вагаўся паміж фазамі палітычнай агітацыі і масавай палітычнай мабілізацыі (БСР Грамада ў Заходняй Беларусі). БССР праз кароткі час пасля яе стварэння выявіла сябе як пастка для беларускіх нацыяналістаў, заплаціўшых сваімі жыццямі за тое, што паверылі ў яе як у сапраўдную беларускую дзяржаву. А мадэль Беларускай Народнай Рэспублікі тым часам апынулася ў стратэгічным запасе беларускай гісторыі.

**Спіс крыніц і літаратуры**


1. Пригожин, И. Философия нестабильности / Вопросы философии. - 1991. - №6. – С. 46–52.

2. Отечественная история – 2007 – № 5.; Федотов, Г. П. Трагедия интеллигенции / Федотов Г. П. О России и русской философской культуре. – Москва: Наука, 1990. – С. 440; Война и общество в XX веке: В 3 кн. Кн. 1. Война и общество накануне и в период Первой мировой войны - Москва, 2002. – С. 556 – 557, 586.

3. Рудовіч, С. Час выбару: Праблема самавызначэння Беларусі ў 1917 годзе – Мінск: Тэхналогія, 2001. – 200 с.

4. Магареев, П. Э. Первая мировая как тотальная война / Новая и новейшая история. – 2004 – № 4. – С. 3 – 16.

5. Головин, Н. Н. Военные усилия России в мировой войне - Москва: Кучково поле, 2001. – 440 с.

6 Степанов, А. И. Общие демографические потери населения России в период Первой мировой войны / Первая мировая война: Пролог XX века. – Москва: Наука, 1999. – С. 474–484.

7. Документы и материалы по истории Белоруссии. – Минск: Изд-во АН БССР, 1953 – Т. 3. – 1018 с.

8. Лигута, В. Н. 810-дневное противостояние в Сморгони / Беларусь у гады Першай сусветнай вайны. Смаргоншчына: трагедыя, гераізм, памяць : матэрыялы міжнарод. навукова-практ. канф. (Смаргонь, 18 – 19 мая 2007 г.) / навук. рэд. А. М. Літвін, У. В. Ляхоўскі, – Мінск: Чатыры чвэрці, 2009. – С. 67–84.

9. Данилов, Ю. Н. На пути к крушению: Очерки из последнего периода русской монархии. – Москва: Воениздат, 1992. – 288 с.

10. Голуб Т. Вечнае поле памяці / Полымя. – 993. – № 2. – С. 6–7.


РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

11. Лосский, Н. О. Характер русского народа / Лосский, Н. О. Условия абсолютного добра. – Москва: Изд-во полит. литературы, 1991. – 372 с.

12. Асташов, А. Б. Русский крестьянин на фронтах Первой мировой войны / Отечественная история. – 2003. – №2. – С. 72–86.

13. Аксёнов, В. Б. Война и власть в массовом сознании крестьян в 1914–1917 годах: архетипы, слухи, интерпретации / Российская история. – 2012. – №4. – С. 137–145.

14. Александров, Н. "Мы сначала возьмём Краков, а потом уже Берлин". Костромская деревня в начале войны / Родина. – 2014. – №8. – С. 112–117.

15. Смольянинов, М. М. Беларусь в Первой мировой войне 1914–1918 гг., Минск: Беларуская навука, 2014. – 216 с.

16. Сенявская, Е. Н. "Без бабы и вина и война не нужна": проблема фронтовой морали в период Первой мировой войны / Историческая психология и социология истории – Москва, 2013. – Т. 6. – С. 32–48.

17. Усебеларускі з'езд 1917 года: сведчанне сучасніка. Прадмова і публ. В. Скалабана / Беларускі гістарычны часопіс – 1993, №1. – С. 68.; Федорченко, С. Народ на войне / С. Федорченко. – Москва: Советский писатель, 1990. – 326 с.

18. Курцев А. Н. Беженство / Первая мировая война: Пролог XX века - Москва: Наука, 1999. – С. 140 – 146; Утгоф, В. С. Белорусские беженцы Первой мировой войны: автореф дис. кандидата историч. наук. – Санкт-Петербург: РАН; Ин-тут истории, 2003. – 26 с.

19. Бежанства 1915 года. – Беласток: Праграмная рада тыднёвіка "Ніва", 2000. – 206 с.

20. Белявина, В. Н. Беларусь в годы Первой мировой войны. – Минск: Беларусь, 2013. – 396 с.

21. Лабынцев, Ю. А. Повествования западнобелорусских беженцев-очевидцев о революционной России, http://www.knizkult.narod/ru/Labyncev.htm – С. 1. – Дата доступу: 2011. 09. 17.

22. Улашчык, М. Бежанства. Публ. А. Ліса; пасляслоўе В. Скалабана / Спадчына – 2001. – №3. – С. 211-222; Баршчэўскі, А. Малая і вялікая айчына ва ўспрыняцці беларусаў з Усходняй Беласточчыны / Беларусіка – Albaruthenica. Кн. 6, частка 1. – Мінск, 1997. – С 298–304; Мушынскі, М. Спадчына Якуба Коласа / Полымя, 1993 – № 7 – С. 236–238.

23. Курцев, А. Н. Беженцы Первой мировой войны в России (1914 – 1917) / Вопросы истории. – 1999. – №8. – С. 9–113.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

24. Лахарева, Н. В. Судьба беженцев Первой мировой войны в Советской России (на примере Курской губернии) / Армия в истории России. Материалы межвуз. научн. конф. – Курск: Изд-во РОСИ, 1997. – С. 77–80
25. Грыневіч В. На рэках Вавілону (Успаміны ўцекача) / Спадчына. – 1997. – №4. – С. 165–182.
26. Дзянніца. – 1918, 19 жніўня. – № 25.
27. Забаўскі, М. Праблемы аўтаноміі беларуска-літоўскіх губерняў у перыяд выбараў і дзейнасці расійскай Дзяржаўнай думы (1906 – 1917 гг.) / Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII – пачатку XXI ст. У 2 кн. Кн. 1. – С. 274–294.
28. Белякевич, И. И. Из истории создания польских национальных формирований в составе русской армии во время Первой мировой войны / Первая мировая война – Москва: Наука, 1968. – С. 158–169.
29. Łatyszonek O. Białoruskie formacje wojskowe. 1917 – 1923 – Białystok, 1995. – 276 s.
30. Рыжанкоў, І. М. Сялянства Беларусі ў вырашэнні грамадска-палітычных і эканамічных праблем (сакавік – кастрычнік 1917 г.): аўтарэф. дыс. кандыдата гіст. навук. – Мінск, 2006. – 22 с.
31. Савіцкі, В. Беларускае войска: ад ідэі да спроб рэалізацыі / Беларускі гіст. часопіс. – 1994. – №4. – С. 60–61.
32 Рыжанкоў, І. М. Да пытання аб удзеле сялянства Беларусі ва ўмацаванні абараназдольнасці краіны пасля перамогі Лютаўскай рэвалюцыі / І. М. Рыжанкоў // Труды БГТУ. – Сер. V. Политология, философия, история, филология. – Вып. XIII – Минск, 2005. – С. 55–59.
33. Письма во власть.1917 – 1927. Заявления, жалобы, доносы, письма в государственные структуры и большевистским вождям. – Москва: РОССПЭН. – 1998. – 528 с.
34. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Ф. 60п. – Воп. 3. – Спр. 751.
35. Великая Октябрьская Социалистическая Революция в Белоруссии. – Т. 2. – Минск: Госиздат БССР. – 1957. – 1067 с.
36. Башко, П. К. Советы рабочих, солдатских и крестьянских депутатов Белоруссии (март – октябрь 1917 г.). – Мн.: Наука и техника, 1987. – 254 с.
37. Кнорин, В. Г. Избранные статьи и речи. – Мн.: Беларусь, 1990. – 303 с.
38. Сяменчык, М. Я. Грамадска-палітычнае жыццё на Беларусі ў перыяд Лютаўскай і Кастрычніцкай рэвалюцый (сакавік 1917 – сакавік 1918 гг.): У 2 ч. Ч. 2: Грамадска-палітычнае жыццё ва ўмовах складвання

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

таталітарнага рэжыму. – Мн.: БДПУ імя М. Танка, 2001. – 160 с.
39. Лёсік Я. Творы: Апавяданні Казкі. Артыкулы. – Мн.: Маст. літ., 1994. – 334 с.
40. Мазец, В. Першыя здзяйсненні БНР у сацыяльна-эканамічнай і культурнай сферы/ Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII – пачатку XXI ст. У 2 кн. Кн. 1. – Мінск: Бел. навука, 2011. – С. 71 – 83.
41. Дзяржаўны архіў у г. Мазыры. – Ф. 307. – Воп. 1. - Спр. 5.
42. LMAB RS. – F. 21. – Bib. 857. – P. 6,45.
43. Дзяржаўны архіў у г. Мазыры. – Ф. 79. – Воп. 1. – Спр. 17.
44. НАРБ. – Ф. 8. – Воп.1. – Спр. 1.
45. Латышонак, А. Гісторыя Беларусі ад сярэдзіны XVIII ст. да пачатку XXI ст. / А. Латышонак, Я. Мірановіч. – Вільня: Інстытут беларусістыкі; Беласток: Беларускае гістарычнае таварыства, 2010. – С. 156–158.
46. Лазько, Р. Беларускі фронт сусветнай рэвалюцыі ў 1920 г. // Да 90-годдзя прыняцця Рыжскага дагавору 1921 г. Матэрыялы з гісторыі польска-беларускіх адносін у XX ст. Зб. навуковых прац. – Мн. : БДУ, 2011. – С. 219–240.
47. Знешняя палітыка Беларусі: Зб. дакументаў і матэрыялаў. Т. 1 (1917 – 1922 гг.) – Мн.: БелНДІДАС, 1997. – 398 с.
48. НАРБ. – Ф. 4п. – Воп.1. – Спр. 155. – Л. 38.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ